**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# НІЖНІКАВА ТАМАРА МІКАЛАЕЎНА

**ОПЕРНАЯ СПЯВАЧКА, НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БССР,**

**НАРОДНАЯ АРТЫСТКА СССР**

**9 САКАВІКА 1925 Г. – 15 ЛЮТАГА 2018 Г.**

**ФОНД № 145**

**ВОПІС № 1**

**1949– 1967 гг.**

**МІНСК 2025**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1**　　　　**ф. 145**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ Т.М. НІЖНІКАВАЙ | 1-14 | 1-3 |
| 1.1. | РЭПЕРТУАР Т.М. НІЖНІКАВАЙ, ПІСЬМЫ ДА ЯЕ, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.М. НІЖНІКАВАЙ | 1-4 | 1 |
| 1.2. | ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Т.М. НІЖНІКАВАЙ | 5-9 | 1-2 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ Т.М. НІЖНІКАВАЙ | 10-12 | 2-3 |
| 1.4. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Т.М. НІЖНІКАВАЙ, І ІНШ. | 13-17 | 3 |

## Прадмова

**Ніжнікава Тамара Мікалаеўна** нарадзілася 9 сакавіка 1925 года ў горадзе Самара (РСФСР). У 1941 годзе скончыла сямігадовую Куйбышаўскую музычную школу [цяпер Дзіцячая цэнтральная музычная школа горада Самара]. У 1943–1949 гадах вучылася ў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І. Чайкоўскага (клас М.У. Уладзіміравай). На выпускным іспыце атрымала запрашэнне на працу ў буйнейшыя оперныя тэатры СССР. Абрала Дзяржаўны Вялікі тэатр оперы і балета БССР (цяпер – Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр Рэспублікі Беларусь)[1]. Праз тры месяцы па накіраванні Камітэта па справах мастацтваў СССР пры Савеце Міністраў СССР пераехала з Мінска ў Албанію, дзе выкладала вакал у Ліцэі мастацтваў у Тыране[2]. У 1951–1976 гадах салістка Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР. З 1964 года адначасова выкладчык Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В. Луначарскага (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі) (у 1976–1986 гадах загадчык кафедры сольных спеваў, з 1980 года – прафесар).

Найбольш вядомыя оперныя партыі (каларатурнае сапрана), выкананыя Т.М. Ніжнікавай у Дзяржаўным Вялікім тэатры оперы і балета БССР у 1951–1976 гадах: Джыльды і Віялеты (“Рыгалета” і “Травіята” Дж. Вердзі), Ірыны (“Калючая ружа” Ю. Семянякі), Марынкі (“Марынка” Р. Пукста), Мюзеты (“Багема” Дж. Пучыні), Разіны “Севільскі цырульнік” Дж. Расіні, Царліны (“Фра-Д’ябла” Ф. Абера і “Дон Жуан” В.А. Моцарта) і інш.

З 1953 года Т.М. Ніжнікава актыўна гастралявала: апроч рэспублік СССР выступала ў Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Канадзе, Польшчы, Фінляндыі, Чэхаславакіі, Швецыі і інш. Падрыхтавала плеяду оперных спевакоў: народную артыстку Беларусі Л.К. Каспорскую, заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь А.Г. Бундзелеву, М.А. Жылюка, В.І. Скарабагатава, А.У. Шведаву і інш.

У 1954 годзе атрымала званне “Заслужаная артыстка БССР”, у 1955 годзе – “Народная артыстка БССР”, у 1964 годзе – “Народная артыстка СССР”. Узнагароджана: Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Рэспублікі Беларусь (1954, 1971, 1983 і 1994), Прэзідыума Вярхоўнага Савета РСФСР (1966), Вярхоўных Саветаў Літоўскай ССР і УССР (1975); ардэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1955), Дружбы народаў (1988), Францыска Скарыны (2001) і Айчыны III ступені (2010); ганаровым значком “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” (2005); медалём ЮНЕСКА “Віктар Гюго” і

---

[1] У артыкуле “Белорусский «соловушка»: голос, который объединял сердца. К 100-летию народной артистки СССР Тамары Нижниковой” (https://bolshoibelarus.by/rus/galereya/5493-nizhnikova.html?showall=&start=1) гаворыцца, што пасля сканчэння кансерваторыі Т.М. Ніжнікава кароткі час працавала ў Маскоўскім акадэмічным музычным тэатры імя народных артыстаў СССР К.С. Станіслаўскага і У.І. Неміровіча-Данчанкі, пасля чаго пераехала ў Мінск.

[2] Н. Тамашова. “Тамара Ніжнікава” (газетная публікацыя). // БДАМЛМ, Ф. 145. Воп. 1, Спр. 10, Л. 4.

дыпломам ЮНЭСКА (2015); прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячоў "Хрустальная Павлинка" (2017).

Т.М. Ніжнікава памерла 15 лютага 2008 года ў Мінску, пахавана на Усходніх могілках.

Дакументы Ніжнікавай Тамары Мікалаеўны паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 1967 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшлі 17 спраў (118 дакументаў) за 1949–1967 гг.

Вопіс складаецца з 2-х невялікіх раздзелаў, дзе прадстаўлены дакументы Т.М. Ніжнікавай і дакументы Б.Г. Скабло і А.М. Саўчанкі (яе 1-га і 2-га мужа). Справы ў радзелах сфарміраваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1949–1967 гады.

Прадмову склала
заг. аддзела В.Ф. Шаталава
31.03.2025

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 145
ВОПІС № 1
1949-1967

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.05.2025
№ 6

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ Т.М. НІЖНІКАВАЙ** | | | | |
| | **1.1. РЭПЕРТУАР Т.М. НІЖНІКАВАЙ, ПІСЬМЫ ДА ЯЕ, АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ Т.М. НІЖНІКАВАЙ** | | | | |
| 1 | Г. Златев-Черкин. “Момини жалби”. Вакальны твор для высокага голасу і фартэпіяна на верш Н. Ланкова (на балгарскай мове).<br>Д. Христов. “Я разтуряй”. Народная песня для спеваў і фартэпіяна (на балгарскай мове).<br>Друкаваныя выданні | 1950, 1954 | 6 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 2 | Пісьмы сакратара Таварыства венгерска-савецкага сяброўства (Венгрыя) і супрацоўнікаў Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механічнай апрацоўкі драўніны Міністэрства лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці СССР да Т.М. Ніжнікавай са святочнымі віншаваннямі, словамі захаплення яе талентам.<br>Канверт пісьма Варшаўскай мытні (Польшча) да Т.М. Ніжнікавай | 1949-1967 | 9 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 3 | Грамата ад в.а. Камандуючага войскамі Беларускай ваеннай акругі на імя Т.М. Ніжнікавай.<br>Выпіска з Загада войскам Беларускай ваеннай акругі і пастановы Прэзідыума ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры аб аб'яўленні падзякі Т.М. Ніжнікавай за культурнае шэфства над Узброеннымі сіламі | 1959-1966 | 4 | 4 | |
| 4 | Запрашальны білет на святкаванне 50-годдзя Куйбышаўскай музычнай школы № 2 (РСФСР) на імя Т.М. Ніжнікавай | 1960 | 2 | 1 | |
| | **1.2. ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Т.М. НІЖНІКАВАЙ** | | | | |
| 5 | Праграмы балетнага спектакля "Мечта" Я.А. Глебава (вакальная партыя Т.М. Ніжнікавай) і оперных спектакляў "Корневильские колокола" Р. Планкета, "Лакме" Л. Дэліба, "Летучая мышь" І. Штрауса і "Молодая гвардия" Ю. Мейтуса | 1953-1966 | 47 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дзяржаўнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР з удзелам Т.М. Ніжнікавай. Праграма опернага спектакля "Риголетто" Дж. Вердзі Новасібірскага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (РСФСР) з удзелам Т.М. Ніжнікавай | | | | |
| 6 | Праграмы юбілейнага вечара В.А. Залатарова, канцэртаў, прысвечаных 88, 89 і 90 гадавінам з дня нараджэння У.І. Леніна, знаходжанню ў БССР караля Афганістана, дэлегацыі Польскай народнай рэспублікі, парламентскай дэлегацыі Рэспублікі Інданэзіі, прэзідэнта Рэспублікі Югаславія Іосіфа Броза Ціта і інш., з удзелам Т.М. Ніжнікавай (на беларускай, польскай і рускай мовах). Праграмы вечара беларускай музыкі і ўрачыстага канцэрта ў Балгарыі з удзелам Т.М. Ніжнікавай (на балгарскай мове) | 1956-1965 | 63 | 19 | |
| 7 | Гастрольныя афішы музычнага вечара і ўрачыстых канцэртаў з удзелам Т.М. Ніжнікавай у Балгарыі і Польшчы (на балгарскай і польскай мовах) | 1958-1959 | 3 | 3 | |
| 8 | Афішы сольных канцэртаў Т.М. Ніжнікавай у Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета БССР і Клубе імя Дзяржынскага (БССР) | 1961, 1965 | 3 | 2 | |
| 9 | Гастрольная афіша фестывалю беларускага мастацтва ў РСФСР з удзелам Т.М. Ніжнікавай і рэпертуарная афіша з опернымі спектаклямі "Риголетто" Дж. Вердзі (Т.М. Ніжнікава ў партыі Джыльды, дачкі Рыгалета) і "Севильский цирюльник" Дж. Расіні (Т.М. Ніжнікава ў партыі Разіны) Новасібірскага акадэмічнага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (РСФСР) | 1966 | 2 | 2 | |
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ Т.М. НІЖНІКАВАЙ** | | | | |
| 10 | Артыкулы і нататкі пра і са згадкай Т.М. Ніжнікавай (на балгарскай, беларускай, польскай і рускай мовах). Машынапіс, выразкі з газет і часопіса | 1952-1966 | 58 | 55 | |
| 11 | С. Ламбина. "Весенний город солнцем залит…". Верш-прысвячэнне Т.М. Ніжнікавай і А.М. Саўчанку (мужу). Аўтограф | 1966 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 12 | "Поёт Тамара Нижникова (творческий вечер народной артистки БССР)". Тэкст радыёперадачы | [1956-1958] | 4 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | з удзелам Т.М. Ніжнікавай.<br>Машынапіс | | | | |
| | **1.4. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ Т.М. НІЖНІКАВАЙ, І ІНШ.** | | | | |
| 13 | Інфармацыйныя праспекты пра балгарскіх кампазітараў і піяністаў М. Галемінава і П. Уладзігерава і інш. (на балгарскай мове) (Балгарыя).<br>Праграмы канцэртаў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР, сімфанічнага канцэрта Беларускай дзяржаўнай філармоніі і інш. (БССР).<br>Друкаваныя выданні, выразкі з газеты | 1958 - [1960-я гг.] | 36 | 11 | |
| | Дакумент Б.Г. Скабло (1-га мужа) | | | | |
| 14 | Запрашальны білет на святкаванне 50-годдзя Куйбышаўскай музычнай школы № 2 (РСФСР) на імя Б.Г. Скабло | 1960 | 2 | 1 | |
| | Дакументы А.М. Саўчанкі (2-га мужа) | | | | |
| 15 | Дароўны надпіс "Заслуженному артисту БССР А. Савченко от благодарных зрителей" ад 30 сакавіка 1966 г. на настольнай папцы з мельхіёравай накладкай з выявай помніка Юрыю Далгарукаму ў Маскве | | 2 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 16 | Грамата ад Камандуючага войскамі Беларускай ваеннай акругі на імя А.М. Саўчанкі і пастановы Прэзідыума ЦК прафсаюзаў работнікаў культуры аб аб'яўленні падзякі А.М. Саўчанку за культурнае шэфства над Узброеннымі сіламі | 1964-1966 | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 17 | А. Сахалтуеў. "Комическая опера". Артыкул са згадкай А.М. Саўчанкі.<br>Абвестка аб выступленні А.М. Саўчанкі на рыдыё.<br>Выразкі з газеты | 1961, 1964 | 3 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 17 (семнаццаць)

спраў з № 1 па № 17 , 118 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла
заг. аддзела ______________ В.Ф. Шаталава
17.03.2025

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння ______________ В.І. Бярэйшык
захаванасці дакументаў

"_____"____________20____ г.